# РАСЦІЦЬ ЧАЛАВЕКА



Сёння да выхавання дзяцей і моладзі мы падыходзім з улікам не толькі станоўчага і адмоўнага вопыту выхаваўчых працэсаў мінулага, але і патрабаванняў цяперашняга часу, характару новых грамадскіх адносін і тых змен, якія адбыліся ў краіне і нашай рэспубліцы ў апошнія гады (чарнобыльская бяда, раскол СССР, прыняцце законаў аб дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь, аб адукацыі і аб мовах, узмацненне працэсу адраджэння нацыянальнай мовы і культуры беларускага народа, будаўніцтва незалежнай дэмакратычнай дзяржавы і разам з тым — паглыбленне эканамічнага і духоўнага крызісу грамадства).

У сваёй рабоце супрацоўнікі аддзялення абапіраюцца на вынікі ана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лізу і вывады Сусветнай камісіі па пытаннях навакольнага асяроддзя і на галоўныя прынцыпы і задачы нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусь (прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, нацыянальна-культурная аснова, гуманізм і дэмакратызм, экалагічная накіраванасць, свядомая павага да сусветнага парадку і мноства культур, умацаванне сям'і). Вырашаючы канкрэтныя актуальныя задачы выхавання, мы маем за найгалоўнейшую мэту выхаванне Чалавека — асобы, якая б спалучыла ў сабе якасці сапраўднага грамадзяніна, працаўніка, сем'яніна, творцы.

Работа аддзялення вядзецца ў двух асноўных напрамках: выхаванне ў нацыянальнай школе; дашкольнае і сямейнае выхаванне.

У лабараторыі праблем выхавання ў нацыянальнай школе (загадчык старшы навуковы супрацоўнік І. І. Казлоўскі) пад навуковым кіраўніцтвам намесніка дырэктара інстытута, кандыдата педагагічных навук У. Ф.Валадзько распрацаваны тэарэтычныя падыходы да стварэння сістэмы выхавання, якая прадугледжвае значныя змены ў змесце адукацыі (асабліва па тых дысцыплінах, якія ўплываюць на станаўленне асобы, — літаратуры, мовах, гісторыі, прыродазнаўству, этыцы і эстэтыцы, выяўленчаму мастацтву, музыцы, фізічнай культуры), а таксама развіццё асобы ў дзейнасці, яе сацыялізацыю праз мову, фальклор, уклад жыцця. У выніку даследавання падрыхтаваны эксперыментальны варыянт канцэпцыі выхавання ў беларускай нацыянальнай школе, які адлюстроўвае нацыянальны змест, шляхі, формы, метады і сродкі выхавання. Гэта вывучэнне гісторыі і культуры роднага краю; праца па выратаванні прыроды і культурна-гістарычных помнікаў; адраджэнне і развіццё народных промыслаў (ткацтва, ганчарнага мастацтва, разьбы па дрэве, пляцення, кавальскай справы); укараненне беларускіх народных святаў каляндарнага цыкла — Калядаў, Вялікадня, Радаўніцы, Купалля, Дзядоў; правядзенне экалагічных, міласэрных і дабрачынных акцый; увядзенне ў практыку сямейнай абраднасці; уключэнне ў змест дашкольнага і школьнага выхавання народных гульняў і інш. Як варыянт асновы выхаваўчай работы прапаноўваецца каляндарная абраднасць беларусаў з яе чатырма гадавымі цыкламі. Удзел у традыцыйных святах і абрадах дае наглядны прыклад класічнай народнай педагогікі, скіраванай на нарастанне актыўнасці школьнікаў, на сумесную вучобу і працу дзяцей, бацькоў, усіх дарослых.

На аснове аналізу тэарэтычнай літаратуры і вывучэння практычнага вопыту ў рэспубліцы, краіне, за мяжой у лабараторыі даследуецца таксама праблема сацыялізацыі моладзі праз вучнёўскае і студэнцкае самакіраванне; ідзе распрацоўка канцэпцыі развіцця самакіравання вучняў і студэнтаў у сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Нарэшце, група даследчыкаў распрацоўвае тэарэтычныя асновы экалагічнага выхавання школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь, прынцыпы перабудовы пазакласнай выхаваўчай работы на аснове комплексна-варыятыўнага падыходу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Лабараторыя дашкольнага і сямейнага выхавання** (загадчык — кандыдат педагагічных навук А. Б. Давідовіч) распрацоўвае тры тэмы: “Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці розных відаў і тыпаў дзіцячых дашкольных устаноў”, “Псіхолага-педагагічныя асновы беларускамоўнага развіцця дашкольнікаў у дзіцячым садзе”, “Тэарэтычныя і метадычныя аспекты функцыяніравання дзіцячых дамоў сямейнага тыпу”.

Па першай тэме створаны эксперыментальныя варыянты праграм для дашкольных устаноў (груп) з гібкім рэжымам работы і па мастацкаму выхаванню. Арыгінальная праграма, накіраваная на развіццё творчых здольнасцей дзіцяці, пабудавана на матэрыяле беларускага мастацтва. У ёй упершыню прапанаваны змест работы па азнаямленні дашкольнікаў з архітэктурай і дызайнам, поўна прадстаўлена тэатральна-гульнявая і мастацка-моўная дзейнасць дзяцей. Яшчэ адна праграма разлічана на тыя дашкольныя ўстановы (групы), дзе дапускаецца кароткачасовае знаходжанне дзяцей — ад 2 да 5 — 6 гадзін у дзень. Яна дае выхавацелю магчымасць успрымаць змест пэўнага навучальна-выхаваўчага раздзела і яго ўскладненні для дзяцей усіх існуючых у групе ўзростаў адначасова, г.зн. такі варыянт асабліва зручны ва ўмовах работы ў рознаўзроставай групе.

Па наступнай тэме зроблены падыходы да праблемы навучання дашкольнікаў другой мове, даследаваны і прааналізаваны асаблівасці стыхійнага засваення рускамоўнымі дашкольнікамі элементаў беларускай мовы. На аснове канстатуючага эксперымента ўстаноўлены прычыны нізкага ўзроўню маўленчай дзейнасці большасці дзяцей (адсутнасць матывацыі маўлення, недастатковае валоданне сродкамі мовы і інш.).

Пры даследаванні трэцяй тэмы вывучаны вопыт беларускіх дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, якія пачалі з'яўляцца ў рэспубліцы ў 1988 г. і ўяўляюць своеасаблівую грамадска-дзяржаўную ўстанову па выхаванні сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

***

Да канца 1992 г. аддзяленне плануе падрыхтаваць праграмы для сямейнага дзіцячага сада і для сямейнага выхавання дзяцей ранніх узростаў (ад 0 да 3 гадоў); пяць раздзелаў дапаможніка “Наша незвычайная сям'я” для бацькоў-выхавацеляў, бацькоў і педагогаў (з вопыту работы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу); серыю метадычных парад і артыкулаў па праблемах выхавання ў нацыянальнай школе; метадычныя дапаможнікі “Кіраванне і самакіраванне ў навучальнай установе: умовы і крытэрыі эфектыўнасці”, “Псіхолага-педагагічныя аспекты і сацыякультурныя перадумовы вучнёўскага самакіравання”, “Студэнцкае кіраванне ў ВНУ” і брашуру “Вопыт экалагічнага выхавання школьнікаў”.

---

*Director of Department of the Belarus Research Institute for Education V.Chechet tells about activities and programmes of creative laboratories and research groups.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ